

Download

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Два гады «хатняй хіміі» і 1000 рублёў кампенсацыі — вынесены прысуд мужчыне за каментар у «Аднакласніках»

У судзе Пінскага раёна і г. Пінска 17 лістапада вынеслі прысуд па крымінальнай справе ў дачыенні да **Дзяніса Стасевіча**, якога вінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса.

Паводле абвінавачвання, 25 чэрвеня 2020 года з мэтай прыніжэння гонара і годнасці супрацоўніка ДАІ **Ігара Вольніча** ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў, Дзяніс Стасевіч у сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” напісаў каментар пад публікацыяй пра міліцыянта на старонцы Вольгі Карач, які на фотаздымку прыціскае каленам шыю пенсіянера, наступнага зместу: ***“С*ка, герой!”***

Стасевіч віну прызнаў цалкам, у здзейсненным раскаяўся. У судзе агучылі паказанні, якія Дзяніс даваў падчас следства: летам 2020 года ён пабачыў у “Аднакласніках” публікацыю, на якой супрацоўнік ДАІ наступіў затрыманаму чалавеку, што ляжаў на зямлі, каленам на галаву ці на шыю, пасля гэтага абвінавачаны, *"паддаўшыся агульнаму настрою і хайпу, а таксама ў сувязі з падзеямі ў ЗША, дзе грамадзяніна паліцэйскі прыдушыў каленам, і грамадзянін памёр, пакінуў негатыўны каментар пад публікацыяй"*. Каментар быў адрасаваны супрацоўнікі міліцыі, які затрымліваў чалавека, бо такі спосаб затрымання Дзяніса моцна абурыў.

Пацярпелы Ігар Вольніч накіраваў заяву ў суд, у якой прасіў спагнаць з абвінавачанага кампенсацыю нанесенай маральнай шкоды ў памеры 1500 рублёў.

Падчас спрэчак бакоў **Ілля Гузарэвіч** прасіў прызначыць абвінавачанаму два гады “хатняй хіміі”, а грамадзянскі пазоў задаволіць у поўным аб’ёме.

У выніку суддзя **Вольга Лубнік** прызнала Дзяніса Стасевіча вінаватым і па арт. 369 КК прызначыла яму **пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову тэрмінам на два гады**, пастанавіла канфіскаваць тэлефон у даход дзяржавы як сродак здзяйснення злачынства і **спагнаць з абвінавачанага на карысць пацярпелага кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў**.
t.me/viasna96/8088
5.6K viewsedited Nov 17, 2021 at 20:26

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy